Газета дзяржаўнай установы адукацыі
“Грычынскі вучэбна-педагагічны комплекс яслі-сад –базавая школа”



# Перапынак!



№2
Кастрычнік, 2020

Школа - гэта родны дом,
Дружна тут усе жывём,
Пра падзеі ў школьным свеце
Мы раскажам у газеце!

## Чытайце ў нумары:

Дзень настаўніка стар. 2
Дзень маці стар. 3
Спартыўная старонка стар. 4
Выбар прафесіі- гэта адказна стар.5
Весткі з дзіцячага сада стар. 6

*Настаўнік. Адно толькі слова, а як многа яно ўвабрала ў сябе. Здаецца цэлы свет. Гэта – незвычайная прафесія, якая звязана з дзяцінствам і патрабуе … Ды чаго толькі не патрабуе прафесія настаўніка. Быць адначасова і выхавальнікам, і псіхолагам, і мастаком, і артыстам, і сябрам, і дарадцам. Напярэдадні свята дзеці падрыхтавалі віншаванні для настаўнікаў і запрасілі на канцэрт.*















**14 кастрычніка** ў нашай краіне адзначаўся Дзень маці. Не абыйшло свята і нашу ўстанову. Гэтаму светламу дню быў прысвечаны святочны канцэрт, у якім вучні ўсіх класаў паказалі сваё майстэрства спяваць, танцаваць, выразна чытаць вершы. Задоўга да свята дзеці рыхтавалі падарункі для сваіх любімых матуль. Ва ўсіх класах былі праведзены класныя гадзіны, на якіх была закранута гэта тэма. Паглядзецъ відэа-версію канцэрта можна на школьным сайце.















# *Спартыўная старонка*

*Ва ўмовах сённяшняга жыцця, заняткі спортам – гэта вельмі патрэбныя мерапрыемствы. Дзеці павіны разумець, што здароўе – гэта сапраўды “наша багацце”! Яго трэба берагчы і тады яно будзе перадавацца ў спадчыну. Таму навучэнцы заўсёды з задавальненнем удзельнічаюць у днях здароўя, спаборнічаюць ў вясёлых эстафетах. Усе ўдзельнікі паказваюць свой спрыт, сілу, хуткасць. А галоўнае – атрымоўваюць зарад бадзёрасці і масу станоўчых эмоцый!*

*Займайцеся спортам, замацоўвайце сваё здароўе!*











# Выбар прафесіі – гэта адказна

Профессий много в мире есть,
Их невозможно перечесть.
Сегодня многие важны
И актуальны, и нужны.
И ты скорее подрастай –
Профессией овладевай.
Старайся в деле первым быть
И людям пользу приносить!



Каб стаць прафесіяналам, майстрам сваёй справы, аб выбары прафесіі трэба задумвацца яшчэ ў школе і, па магчымасці, рыхтавацца да яе.

Навучэнцы 5-6 класаў прынялі удзел у гульні па прафарыентацыі «Свет прафесій». Дзеці ўдзельнічалі ў конкурсах «Розныя прафесіі», «Пазнавай-ка», «Самая – самая…», «Пантаміма» і інш., падчас якіх даведаліся шмат цікавага аб працы, прафесіях, неабходных рысах характару для той ці іншай спецыяльнасці.







*У кастрычніку ў нас адбылося шмат розных падзей. Мы святкавалі маміна свята, удзельнічалі ў розных мерапрыемствах і весела даведваліся пра што-небудзь новае.*











